якасці і эфектыўнасці выкарыстання каталогаў канкрэтных бібліятэк і дыскусіі на лекцыйных, семінарскіх занятках.

*Мазанік В.У., выкладчык*

## АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ КІРАЎНІКОЎ АРКЕСТРАВЫХ КАЛЕКТЫВАЎ НА ФЗН У БЕЛАРУСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ

Сярод спецыяльных дысцыплін на факультэце завочнага навучання, мэта вывучэння якіх – падрыхтоўка кіраўнікоў аркестравага калектыву, адной з вядучых з'яўляецца дырыжыраванне. У сучасную пару існуе наступная сістэма падрыхтоўкі дырыжорскіх кадраў на дзённым і завочным аддзяленнях: сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы (музычныя вучылішчы, вучылішчы мастацтваў), вышэйшыя навучальныя ўстановы (акадэмія музыкі, Беларускі універсітэт культуры), вышэйшая ступень дырыжорскай адукацыі – аспірантура-стажыроўка пры акадэміі музыкі. Такім чынам, склалася пэўная паслядоўнасць навучання, што і дазваляе рыхтаваць дырыжораў, кіраўнікоў аркестравых калектываў для прафесійных самадзейных аркестраў.

На факультэце завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры падрыхтоўка кіраўнікоў аркестравых калектываў ажыццяўляецца на кафедрах духавой музыкі, народна-інструментальнай творчасці. Асоба кіраўніка аркестра выхоўваецца ў выніку яго авалодвання комплексам спецыяльных дысцыплін. Апошні фарміруе ў студэнта веды, навыкі, адпаведныя здольнасці. Гэта вельмі неабходна для будучай працы па спецыяльнасці. Навучанне па спецыялізацыях ажыццяўляецца, між іншым, пры дапамозе розных форм вучэбнай работы – індывідуальных, групавых, калектыўных заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўная задача курса дырыжыравання заключаецца ў тым, каб выхаваць усебакова адукаванага музыканта. Мэта вывучэння дырыжыравання – гэта авалодванне сродкамі і метадамі кіравання аркестравым калектывам на ўсіх этапах дырыжорскага працэсу. Для падрыхтоўкі высокакваліфікаванага спецыяліста ў класе дырыжыравання трэба вырашаць такія задачы:

— фарміраванне прафесійнай накіраванасці студэнтаў,

— развіццё агульнамузычных і выканальніцкіх здольнасцей,

— авалодванне тэхнікай дырыжыравання і комплексам сродкаў кіравання аркестравым калектывам,

— выхаванне прафесійных якасцей,

— авалодванне прыёмамі самастойнай работы над музычнымі творамі перад рэпетыцыямі з аркестрам,

— выхаванне мастацкага густу, музычнай культуры,

— сістэматычнае вывучэнне рэпертуару самадзейных прафесійных аркестравых калектываў.

Паспяховае вырашэнне вышэйназваных задач магчымае пры ўмове комплекснага вывучэння, узаемадзеяння шэрагу музычна-тэарэтычных і спецыяльных дысцыплін: тэорыі музыкі, сальфеджыо, гармоніі, інструментоўкі, чытання партытур, аналізу музычных твораў, спецінструмента, методыкі работы з аркестравымі калектывамі і інш.

Выхоўваючы студэнта-завочніка як будучага кіраўніка аркестравага калектыву неабходна мець дакладнае ўяўленне пра структуру яго прафесійных магчымасцей, якія ўключаюць:

— агульныя музычныя здольнасці,

— агульныя выканальніцкія здольнасці,

— спецыяльныя дырыжорскія здольнасці,

— педагагічныя здольнасці,

— арганізацыйныя здольнасці і інш.

Галоўнае ў выхаванні будучага спецыяліста – гэта фарміраванне прафесійнай накіраванасці. Ва ўмовах вучэбнай установы яе ўспрымаюць як з'яўленне ў студэнта

патрэбнасці ў дырыжорскай дзейнасці, пастаянным удасканаленні, развіцці ўсяго комплексу ведаў, навыкаў.

На развіццё агульных музычных здольнасцей студэнта-завочніка аказвае ўздзеянне не толькі вучэбны працэс падчас залікова-экзаменацыйных сесій. Гэта і шэраг пазавучэбных фактараў: сродкі масавай інфармацыі, тэлебачанне, тэатр, канцэрты і г.д.

Агульныя выканальніцкія здольнасці развіваюцца ў працэсе заняткаў як па дырыжыраванні, спецыяльным інструменце, так і па фартэпіяна, інструментоўцы, чытанні партытур і інш.

Дырыжорскія здольнасці развіваюцца ў класе пад непасрэдным уздзеяннем выкладчыка, а таксама ў час самастойных заняткаў студэнта, уважлівага назірання яго за работай іншых дырыжораў. Тут, калі ўлічыць спецыфіку завочнага навучання, галоўнай умовай паспяховага навучання студэнта можна назваць яго самастойную работу. Развіццё актыўнасці, самастойнасці студэнта-завочніка павінна быць у цэнтры ўвагі выкладчыкаў, таму што без названых якасцей нельга падрыхтаваць паўнацэннага спецыяліста.

У штодзённай рабоце кіраўніка аркестравага калектыву ўзнікае нямала розных вучэбна-выхаваўчых задач. Яны патрабуюць для свайго вырашэння даволі высокага ўзроўню педагагічнага майстэрства.

Работа кіраўніка немагчымая найперш без арганізацыйнай дзейнасці, заснаванай на ўменні падтрымліваць зносіны з людзьмі, планаваць, накіроўваць вучэбна-выхаваўчую і канцэртную работу калектыву.

Выкладчык добра павінен ведаць гэтую структуру прафесійных здольнасцей кіраўніка аркестравага калектыву для таго, каб выхаваць у студэнта патрэбныя якасці.

Аналіз падрыхтоўкі кіраўнікоў аркестравых калектываў у Беларускім універсітэце культуры дазваляе вылучыць такія тры этапы работы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Індывідуальныя заняткі, дзе адбываецца засваенне музычнага матэрыялу, фарміраванне выканальніцкай задумы.

2. Гукавое ўвасабленне яе, апрабацыя атрыманых навыкаў у аркестравым калектыве.

3. Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену з наступным публічным выкананнем музычнага твора.

Разгледзім асноўныя этапы падрыхтоўкі кіраўнікоў аркестра паасобку з улікам спецыфікі завочнага навучання.

Індывідуальныя заняткі па дырыжыраванні – гэта работа ў класе, дзе ставяцца і вырашаюцца шматлікія задачы: вывучэння музычнага матэрыялу, развіцця тэхнікі дырыжыравання, дасканалага вывучэння партытуры і аркестравых інструментаў, развіцця ўнутранага слыху студэнта-дырыжора, аркестравага мыслення ў яго; вызначэння формы музычнага твора, фарміравання выканальніцкай задумы і інш. Але на факультэце завочнага навучання ўзнікае шмат складанасцей у сувязі з вялікай залікова-экзаменацыйнай сесіяй, а гэта якраз час, калі студэнт-завочнік мае магчымасць займацца індывідуальна.

Тут можа быць толькі адзін выхад – актывізацыя ўласнай работы студэнта-завочніка ў міжсесіённы перыяд. Толькі пры максімальнай эфектыўнасці гэтай работы студэнт здолее дасягнуць паспяховых вынікаў. Самастойная работа з музычным творам набывае вялікае значэнне, бо на ёй заснаваны першы этап дырыжорскай работы – азнаямленне з творам, фарміраванне выканальніцкай задумы. Спецыфіка работы патрабуе асаблівых формаў педагагічнага ўздзеяння. Выкладчык мусіць навучыць студэнта метадам і прыёмам самастойнай работы над музычным творам.

Яна ўключае прайграванне музычнага твора на фартэпіяна (чытанне партытур), праслухоўванне твора ў запісе, усебаковы аналіз формы, мелодыі, гармоніі, інструментоўкі, фактуры твора, выяўленне спецыфікі стылю, жанру твора, знаёмства з матэрыяламі пра кампазітара і яго эпоху. У выніку прыходзіць разуменне аўтарскай задумы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміруецца выканальніцкі план. Вынікам самастойнай работы студэнта становіцца ўвасабленне музычнага твора ў дырыжорскіх жэстах.

Без грунтоўнай падрыхтоўкі студэнту-завочніку, як правіла, не ўдаецца за перыяд залікова-экзаменацыйнай сесіі атрымаць неабходныя веды, навыкі па яго прафілюючай дысцыпліне. Таму трэба планаваць самастойную работу выкладчыка са студэнтам на час паміж сесіямі.

На індывідуальных занятках неабходна, каб працэс работы ў дырыжорскім класе ад самага пачатку праходзіў так, як гэтага патрабуюць канкрэтныя абставіны ў калектыве. Тут патрэбна фарміраваць у студэнта некаторыя навыкі: уменне ўносіць папраўкі, выказваць пажаданні, рабіць перапынкі ў выкананні; выхоўваць звычкі нічога не прапускаць, адразу ж выпраўляць памылкі. Работа ў класе з канцэртмайстрам-піяністам рыхтуе студэнта да сустрэчы з аркестрам, на якой адбываецца апрабацыя набытых раней навыкаў.

Гэты другі этап навучання студэнта-завочніка складаецца не толькі з недахопаў і праблем, але амаль выпадае з сучаснай сістэмы падрыхтоўкі кіраўніка аркестра. Калі студэнты дзённага аддзялення могуць праходзіць практыку ў аркестравым калектыве, праслухоўваць і рыхтаваць свае ўласныя інструментоўкі ў аркестры, дык студэнты факультэта завочнага навучання пазбаўлены ўсіх гэтых умоў. Аднак жа складаная структура аркестравых рэпетыцый, абумоўленая самой спецыфікай заняткаў, стварае выдатныя ўмовы для прафесійнай падрыхтоўкі, фарміруе асобу дырыжора.

Для ўдасканалення працэсу прафесійнай падрыхтоўкі студэнта-дырыжора на факультэце завочнага навучання прапануем такія меры.

— Актывізаваць практычную работу студэнта з аркестрам за кошт рэпетыцый у час залікова-экзаменацыйнай сесіі.

— Прапанаваць студэнтам на рабочых месцах мець калектыў (ансамбль, аркестр) для набыцця практычнага вопыту паміж сесіямі.

Выкладчык – кіраўнік аркестра завочнікаў — павінен планаваць рэпетыцыйную работу, рэпертуар калектыву, улічваючы пералічаныя задачы. Вынік працы з аркестрам – удзел студэнта ў якасці дырыжора ў справаздачным канцэрце напрыканцы сесіі.

Калі гаварыць пра набыццё практычнага вопыту паза універсітэтам, то гэтая прапанова мае падставы для рэалізацыі. Справа ў тым, што студэнты факультэта завочнага навучання звычайна працуюць у музычных школах, Палацах культуры, клубах, дзе найчасцей існуюць вучнёўскія, самадзейныя ансамблі, аркестры. Гэтыя калектывы з'яўляюцца выключнай базай для дырыжорскай практыкі студэнта-завочніка.

Разглядаючы праблему падрыхтоўкі кіраўнікоў аркестравых калектываў на факультэце завочнага навучання, можна зрабіць вывад аб тым, што асноўнай арганізацыйна-метадычнай задачай неабходна лічыць удасканаленне навучальнага працэсу – ад індывідуальных заняткаў да практычнай работы з аркестравым калектывам. Гэта крыніца набыцця навыкаў кіраўніка аркестра, якая спрыяе павышэнню прафесійнага ўзроўню, патрэбнага для паспяховай творчай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Малахава І.А.,*** *дацэнт*

## ТЭХНАЛОГІЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ ПРЫ ВЫКАНАННІ СЕМЕСТРАВЫХ ЗАДАННЯЎ ПА ІНСТРУМЕНТАЗНАЎСТВЕ І ІНСТРУМЕНТОЎЦЫ

Дыстанцыйнае навучанне студэнтаў мастацкіх спецыялізацый мае яскравую спецыфіку, звязаную, па-першае, з наяўнасцю вялікага аб'ёму самастойнай працы